Шары́піна са́мая восто́чная дзярэ́ўня ў сельсаве́це. І мно́гія так іх зва́лі. А с Забо́р'я мужыко́ў зва́лі **батрака́мі**, патаму́ што яны́ с сабо́й е́сьці насі́лі у то́рбах, і́менна вот у то́рбах, як у батрако́ў. Эта яны там у стройбрыга́дзе рабо́талі. А адзі́н кста́ці с сабо́й усігда́ шашэ́нь браў, э́та такі́ блін то́ўсты, і самаго́ яго **Шашэ́нь** называ́лі. Усё, пасле́днюю табе́ гавару́, зато́ са́мую сьме́шную. Ра́ньшы па дзяраўня́х хадзі́ў чалаве́к і скупля́ў макулату́ру, цветме́т, тра́пкі. Ішо́ў і крыча́ў: ба́пкі, тра́пкі! І ўсе гавары́лі: вунь **Ба́пкі-Тра́пкі** ідзе́ць. Во так. Хва́ціць. Ужэ́ му́сіць штук сто табе ўспо́мніла, а с па́пкам дык то́чна [КЛМ].

***Д.М. Кузьміна***

## З гаворкі вёскі Прыбярэжжа Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці

Матэрыялы сабраныя ў 2009 г. студэнткай аддзялення "Беларуская філалогія" БДУ *Кузьміной Дар'яй Міхайлаўнай*.

Запіс праводзіўся ў в. Прыбярэжжа, якая знаходзіцца ў Грудзінаўскім пасялковым савеце Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У вёсцы 62 двары, у дадзены момант 17 з іх – жылыя. Жыхары з'яўляюцца беларусамі. Ад раённага цэнтра Быхава – 20 км, ад абласнога цэнтра Магілёва – каля 70 км. Мясцовая назва вёскі – *Пры́беражы*. Жыхары называюць сябе *прыбярэжанцы (жан. прыбярэжанка, муж. прыбярэжанец).* Назву вёскі тлумачаць так: вёска знаходзіцца на беразе ("пры беразе") ракі Пална.

**Інфарматар:**

*Капранькова Зінаіда Давыдаўна,* 1933 г. н., адукацыя 10 класаў, мясцовая.

***Як даўней варажылі***

Гада́лі, зна́іш, во гаво́ря та́к, бе́галі (ба́ба ўжо раска́звала, як дзе́ўкамі былі́) пад о́кны падбягі́м, як ні зна́ю на які́я Каля́ды: на пе́р'выя ці пе́ряд Но́вым го́дам. А тады́ ж лю́дзі, зна́іш, саблюда́лі ўсё: вот абязя́цельна на́да тапі́ць (пе́чку ж яны́ і тапі́лі, кане́шне, тады́ ж не было́ ў іх, пе́чку ка́ждый дзе́нь тапі́лі), а бліны́ ж пяклі́. Вот бліны́ пяку́ць, пе́рвы блін на́да схваці́ць і на у́ліцу вы́скачыць і слу́хаць, і дзе́, напрыме́р, саба́ка забрэ́ша, туды́, у тэ́й бо́к, яна́ за́муж вы́йдзе. Ну́, тако́е, зна́іш... Ішчэ́ мно́га яна́ тако́га раска́звала.

Гада́лі, пад во́кны падхадзі́лі і слу́халі, яко́е сло́ва ска́жуць, там, напрыме́р, на ката́ ці... "Псі́к, вон!", та́к, ска́жа е́слі "Псі́к, пашо́ў во́н!" – зна́чыць, у-уй, тады́ дзе́ўка та́я пачу́ла тако́е – за́муж вы́йдзе ў гэ́тым гаду́ (што вон жа ката́). А е́слі "На печ пайшо́ў!" ці "Ся́дзь на пе́чы!" – тады́ гэ́тая ўжо́ бу́дзе сядзе́ць у дзе́ўках.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

### *Што было, як маці памерла*

Во, малы́я сядзі́м. Во ба́ба раска́звала, зна́іш, тако́е, пра сябе́ раска́звала ўсё. Яна то́жа сірато́й астала́ся, малы́я паства́ліся сіро́тамі, сістра́ ў яе (ма́міна ма́ма), сістра́ астала́ся, мале́нькая, дзіцёнак грудны́ аста́ўся і бра́т. Бра́т быў ста́ршы са́мы, наве́рна... Не́, ба́ба Ма́р'я была́ ста́ршая. Маю́ О́льга зва́лі ба́бу, срэ́дняя і мале́нькая ў іх яшчэ́ была́ дзе́вачка. І ма́тка ўмірла́ іх. А ба́цька, гаво́ря, лесніко́м быў. Ма́тка ўмірла́, а мы́, гаво́ря, баі́мся начува́ць адны́. Адны́х жа, гаво́ря, як кі́не, другі́ раз, начува́ць адны́х. Другі́ раз, у Асаве́ц туды´ далёка ўсё абхо́д дзе́лаў ле́са е́тага. Мы тады́ на печ клёпак (ну, ён дзе́лаў такі́я я́шчыкі з клёпак із дзерав́янных і стру́жкі страга́ў жа). Стру́жкі ў нас на пе́чы і е́тыя клёпкі на пе́чы. Мы, гаво́ря, накладзём, накладзём гэ́тых клёпак на край пе́чы (печ была́ бальша́я), паля́жам гало́вамі ўсе на гэ́тыя клёпкі. Ноч, гаво́ря, другі́ раз, ві́дная-ві́дная, ме́сячная. У ха́ту дзьве́ры ў нас адкрыва́юцца... Я, е́слі б, зна́іш, гэ́та не ба́ба мне раска́звала (на́ша ба́ба была́ така́я харо́шая і набо́жная, да́жа па-ма́цернаму яна́ не руга́лася, вось пражыла́ ве́к і го́ра тако́е паба́чыла, а па-ма́цернаму яна́ не руга́лася, яна́ то́ка во́: "Ах, смуро́д ваню́чы!", е́слі яе́ рассе́рдзіць). Гаво́ря, дзьве́ры адкрыю́цца, і ў ха́ту захо́дзя, ба́чым, што жэ́ншчына захо́дзя. А ў пласта́х тады́ які́х-то харані́лі, я ня зна́ю, у які́х, яна гавары́ла, у пласта́х. (У які́х пласта́х?.. Ну, во, зна́іш, не́шта тако́е із палатна́ завя́звалі на галаву́, як мерцвяка́ ў гро́б кла́лі). Дахо́дзя да стала́, гаво́ря, во руко́й стук-стук па сталу́, а тады́ як аблакаці́цца во так во, сядзі́ць, паку́ль пе́вень пе́рвы не запяе́ць. І мы, гаво́ря, сядзі́м. Ні пуга́ла нас, ніч́ога. Сядзі́м, ляжы́м і шэ́пчам адзі́н аднаму́. Другі ра́з, гаво́ря, і саба́ка з ёй за́йдзе. Тады́, гаво́ря, пе́вень як запяе́ць, встаёт і пайшла́. Другі ра́з, ляп дзьвяра́мі. Саба́ка, другі ра́з, у ха́це застане́цца, а калі́ і за ёй вы́йдзе. Тако́е было́.

### *Як мяса паварылі*

Мно́га чаго́ яна [баба] раска́звала... Ага́, пе́чку як тапі́лі яны – ба́ба гэ́та бо́льшая і ме́ншая. Хлеб са́мі пяклі́ (яшчэ́ ма́чыхі ня браў ба́цька). Забі́ў парасёнка ба́цька, ну забі́ў, у я́шчыкі папакла́ў, ужо́ як ён папакла́ў: мя́са аддзе́льна, са́ла аддзе́льна; і ...: "Дзе́ці, звары́це мя́са". Ну і са́м, гаво́ря, пайшо́ў. "Звары́це мя́са, дзе́ці"... Мы, гаво́ря, узя́лі ўсё (я хахата́ла, аж пamі́ра́ла со́ смеху). Мы паўця́гвалі гэ́та ўсё мя́са з я́шчыкаў у ха́ту. Сасе́дскія дзе́ці папрыхадзі́лі. (А тады ўсло́нцы, гаво́ря, стая́лі так во, зна́іш, стол і з е́тай стараны́, і з е́тай (сту́льчачкаў жа ні было́) дашча́ныя з до́сак). У чугуны́, які́я былі́, панаклада́лі, пе́чку затапі́лі. Усё, пе́чку вы́тапілі, чугуны́ э́тыя паўпіра́лі ў пе́чку. Усё мя́са павары́лі. (Каб жа ён прынёс: "Звары́це, дзе́ці, е́тае мя́са" (так?), яны б звары́лі ды й з'е́лі.) Выця́галі гэ́тыя чугуны́, дзе́ці е́тыя е́лі і па ўсло́нцах бе́галі, дурэ́лі. Ве́чар стаў, гаво́ря, дзе́ці дамо́й парасхадзі́ліся, а мы´ ўго́лас. Прыхо́дзя ба́цька, спра́шае:

– Звары́лі, дзе́ці мя́са?

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

– Звары́лі.

Як паглядзе́ў: мя́са ўсё пава́ранае. Я гаварю́: “Што, ён вас ругáў?”

Нé, як сеў, сядзéў, сядзéў ціхенька, штó ты здзéлаеш – сам дзед вінавáты.

***Зданнё***

І янá, бáба, гавары́ла: “Во, дзéтачкі, Бóгу цяпéрь ужо ня вéряіце, і не хрэ́сцяцца цяперь. Я ўжо ня ўбáчу тóга, а вы яшчэ́ мóжаце ўбáчыць. Во абрáтна éслі адкáжуцца ад Бóга і маліцца ня бýдуць, абрáтна тое сáмае бýдзець”.

І казáла, яе брат рáньша ня вéріў. “У-у, я б іх так ды éтак, éслі б éта мне здалóся!” А тады́, гавóря, з гуля́ння раз ішóў. Я ж гаварý, блíзка там íхняе гумнó стая́ла ля клáдбішча. Ішóў, скóка ён ішóў, і, гавóря, ідзéць па дарóзе, а наўпрóціў яму удвýх, вíдна, жэ́ншчыны ідýць. Ну, так яму здалóся. І разгавáріваюць. І ён ідзёць прáма (ну што ты, смéлы), ідзёць пра́ма на іх. А тады́ яму ўжо стрáшна, як блі́зка зблізіўся, стáла яму стра́шна. І ён як дасць з дарóгі ўбок бягóм! А яны тады гавóраць (і ён пачýў): “Ну, хітры, маладзéц. Бóльша б ты тут не хадзíў”. Дык послі тóга ўжо бая́ўся неізвéсна як. А то, што, гавóря, хто раскáзвае, што вот бáчыў, здавáлася, ён ня вéріў. А самóму як прыйшлóся, дык пабéг уцякáць.

Ну, дык гавары́лі так, што éслі здаéцца што, то нáда ўбок тады́ зварáчваць з дарóгі. Не бéгчы ні ўзад, ні ўпярёд па дарóзе, а ўбок звярнýць, асóбена ў прáвы.

І чалавéк у Пераклáдавічах... (Тады нéйкія былí... Ці кармá нéйкая, ці што... А, карчмá, во!). Хадзілі ў карчмý мужчы́ны, гавóря, і такíя, што любíлі падвы́піць. І вось Шáкаў, дзед Шáкаў (ну, фамíлія Шáкаў). І, гавóря, тóжа ішóў п’я́ны. А павóзка éхала з канём. Так. А ён п’я́ны хватáўся: “Во, падвязíце мянé”. Ну, хватáўся п’я́ны. А яны гавóраць: “Ну, дзед, сяйчáс падвязýць цябé!” Як павялі, хтó-та як павёў у лес сюды´, дык тры дні не маглí дзéда éтага знайсці. І ён ужó раскáзваў, што вядýць, вядýць, пасáдзяць на пень (а хто і што – чорт яго знáе), пасáдзюць на пень і сук яму ў рот дадýць: “Дзед, куры´ трýбку”. За тры дні чуць нашлí éтага дзéда. І празвáлі тóе мéсца Шáкава печ. І цяпéрь тóе мéсца ў Пераклáдавічах бáбы знáюць.

***Сон на новым месцы***

А вот Бóг ёсць на свéце. Знаíш, штó-та, штó-та ёсць на свéце. Таму штá, знаíш, я пяць клáсаў як кóнчыла і с цёткай сваёй паéхала, і дзя́дзька там (бáцькаў брат) у Гóмілі у дóм óтдыха у Тачóнкі там (як ён там называ́ецца). Ён быў глáўным бугáлцерам там. І сказáў во: “Прыéдзь ка мне з Зінам, з Зéнай ка мне туды́”. Палажы́лісь на палý там. У дзя́дзькі кóмната былá там. Ну, мáльчык у іх быў, жóнка ў цюрмé былá, і бáба там былá (éта мая́ Кáця), мáльчыка гэ́тага глядзéла. І дзя́дзька.

Ну, мы з цёткай лажы́ліся на палý, там нам паслáлі. І яна гавóря на мянé:

- Загáдвай сóн на нóвым мéсці.

Я гаварý:

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

- А які́ сон?

- Каб сасні́ўся жані́х нявéсце, – яна́ мне сказáла.

Ну, я пяць клáсаў кóнчыла. А дзéд éты хадзі́ў са мнóй у шкóлу. Да вайны́ яшчэ́ пачáў хадзі́ць. Ён стáршы мяне быў.

Ну, я штó. І я, навéрна, і задýмала ці гавары́ла, мóжа, штó. І ўбáчыла ва сне́ éтага дзéда. А ён тады´ быў такí малы´ і ўрэ́дны-ўрэ́дны. Й, ой-ёй-ёй, прачнýлася, мне так не панрáвілася!

- Ну, штó ж. Нáда мне такí-та жанíх бýдзе?! Ой, гэ́та няпрáўда.

А во, бáчыш, прáўда. Вот, ві́дзіш, штó-та ёсць. І нікагдá нікамý не павéрыла, éслі б мне хто раскáзваў.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)